# ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ НАВУЧЭНЦАЎ: ПАНЯЦЦЕ І СУТНАСЦЬ

**К.І. Шык**
*аспірант УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

На сучасным этапе развіцця нашай краіны патрыятычнае выхаванне з'яўляецца прыярытэтнай задачай, што выяўлена ў Законе аб культуры, Кодэксе аб адукацыі Рэспублікі Беларусь, нарматыўных і іншых дакументах. Аднак сёння не існуе дакладна распрацаванай і рэалізаванай методыкі патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі. Гэта абумоўлена тым, што патрыятызм не мае пэўнага адзінага азначэння сярод даследчыкаў, а тым больш сярод грамадства, у якім патрыятызм зводзіцца толькі да любові да Радзімы. Таму неабходна вельмі істотна прааналізаваць і выявіць сутнасць патрыятычнага выхавання, яго структуру і спосабы ўздзеяння на падрастаючае пакаленне. Для поўнага разумення гэтага паняцця варта звярнуцца да прац беларускіх і замежных даследчыкаў XX ст. і сучаснасці.

А.А. Грымаць адзначае, што патрыятызм – гэта ідэалогія і псіхалогія, палітыка і дзейнасць, у якіх адлюстроўваюцца адносіны сацыяльных суб'ектаў да рэальнага стану Бацькаўшчыны і забяспечваецца сацыяльная актыўнасць яе грамадзян [3, с. 30]. В.В. Буткевіч асобна вызначае нацыянальны патрыятызм як фарміраванне і ўмацаванне нацыянальнай самасвядомасці грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, гонар за сваю краіну, яе гісторыю, культуру, інтарэс і павагу да гісторыі і культуры іншых народаў, гэта разуменне таго, што беларуская нацыя павінна абагачацца лепшымі дасягненнямі сусветнай культуры, не губляючы пры гэтым свайго нацыянальнага [1, с. 12]. С.С. Кацэвіч піша пра патрыятызм асобы як пра маральную якасць, якая выступае як станоўчае праяўленне яе патрыятычнай свядомасці (веданне аб мінулым і сучасным стане сваей Бацькаўшчыны, інтарэсах свайго народа, гатоўнасці абараняць яе незалежнасць, множыць яе матэрыяльнае і духоўнае багацце, адстойваць гонар і годнасць сваёй нацыі, ведаць і любіць родную мову, нацыянальную культуру) [5, с. 18].

Такім чынам, з прыведзеных азначэнняў бачна, што патрыятызм – гэта не проста абстрактнае паняцце, а канкрэтныя адносіны чалавека да тых мясцін, дзе ён нарадзіўся і рос, клопат аб сваім доме, паважлівыя адносіны да роднай мовы, да традыцый, сімвалаў і іншых каштоўнасцей грамадства, дзейнасць накіраваная на карысць Радзімы. Аднак, што закладзена ў паняцці «радзіма».

Як піша А.Л. Барчук: «Радзіма – гэта адна з форм быцця народа на макрасацыяльным узроўні, у межах якой аб'яднанне людзей у супольнасці спалучаецца з іх адноснай адасобленасцю. Радзіма ўяўляе сабой сацыяльны арганізм, у развіцці якога суіснуюць сістэмы розных сацыяльных адносін, абумоўленыя гістарычнай спадчынай, нацыянальным характарам і іншымі падобнымі фактарамі» [2, с. 11].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, у паняцці «радзіма» можна ўбачыць сацыяльныя асаблівасці, якія характарызуюць нацыю: культура, агульныя рысы сацыяльна-псіхалагічнага аблічча, усведамленне адзінства. Падсумаваўшы вышэй сказанае, можна вывесці тэзу, што гэта паняцце адлюстроўвае не толькі суіснаванне сацыяльных арганізмаў, але і вызначае цэлы комплекс сацыяльных і духоўных з'яў, якія ўяўляюць сабой пэўную сітэму каштоўнасцей.

Да асноўных каштоўнасцей Радзімы, успрыманне якіх фарміруе адпаведную сацыяльную ацэнку суб'екта, можна аднесці:

– асобу самога чалавека, яго жыццё і дзейнасць;

– спецыфічныя каштоўнасці сацыяльных груп, якія складаюць грамадства (у тым ліку і нацыянальныя);

– каштоўнасці эканамічнай сферы (вытворчыя сілы, вытворчыя адносіны, працэс і вынікі працы);

– каштоўнасці сацыяльна-палітычнай сферы (грамадскі лад, палітычныя арганізацыі, сацыяльная структура, неэканамічныя сацыяльныя адносіны)

– духоўныя каштоўнасці (навука, адукацыя, ідэалогія, псіхалогія, культура, традыцыі і г. д.)

– прыроду краіны.

Адсюль вынікае, што прадстаўленыя каштоўнасці вызначаюць кірунак і дзейнасць педагога, інакш кажучы, выводзяць нацыянальныя стандарты патрыятычнага выхавання.

Для таго, каб вызначыць магчымасці прымянення дадзеных каштоўнасцей, трэба даць азначэнне патрыятычнага выхавання навучэнцаў, для гэтага прааналізуем падыходы розных даследчыкаў да сутнасці гэтай педагагічнай дзейнасці. В.В. Буткевіч вызначае патрыятычнае выхаванне як «фарміраванне ў навучэнцаў важнейшых духоўных якасцей, патрыятычных пачуццяў, клопату аб інтарэсах сваей Радзімы, гонару за мінулае сваёй краіны» [1, с. 13]. Такое азначэнне не зусім дакладнае, бо не ўключае ў сябе ўсіх аспектаў патрыятычных каштоўнасцей і звернута ў першую чаргу на развіццё эмацыянальна-пачуццёвай сферы навучэнцаў. Аднак патрыятычнае выхаванне мае больш глыбокі сэнс, пра што піша С.С. Кацэвіч, дзе сумяшчае яго з выхаваннем грамадзянскаці: «Выхаванне патрыятызму – гэта адначасова і выхаванне пачуцця грамадзянскасці, якое ажыццяўляецца у сям'і, дашкольных выхаваўчых установах, агульнаадукацыйнай школе [5, с. 14]. Падобнага меркавання прытрымліваецца і М.А. Дзегцярова, якая лічыць, што: «патрыятычнае выхаванне – гэта фарміраванне ў чалавека духоўных каштоўнасцей, якія адлюстроўваюць спецыфіку развіцця нашага грамадства і дзяржавы, нацыянальнай самасвядомасці, светаразумення і адказнасці за лес Радзімы» [4, с. 158].

Абагульняючы і дапаўняючы папярэднія паняцці, цікавае азначэнне дае В.В. Чэчат, які піша, што: «патрыятычнае выхаванне – гэта выхаванне любові да Радзімы, падтрымка, развіццё, і магчымасць накіраваць педагогам памкненні асобы да набыцця і выкарыстоўвання на практыцы навуковых ведаў, у тым ліку ведаў гісторыі Радзімы і яе народа. Выпрацоўка ў грамадзян запатрабавання сваёй будзёнай вучобай і працай уносіць канрэтны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўнесак ва ўкараненне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны» [6, с. 4, 5]. Такім чынам, аўтар выказвае пазіцыю наконт таго, што патрыятычнае выхаванне абавязкова павінна быць не толькі эмацыянальна-пачуццёвым, а яшчэ і дзейсным.

Такім чынам, можна сцвердзіць, што выхаванне патрыятызму аб'ектыўна абумоўлена патрабаваннямі грамадства, што гэта катэгорыя маральная, заснаваная на развіцці ў асобы ўсяго чалавечага: дабрыні, спачування, міласэрнасці, інтарэса да духоўных, матэрыяльных каштоўнасцей Радзімы. Патрыятычнае выхаванне накіравана на развіцце ў навучэнцаў пачуццяў, каштоўнасных арыентацый, ведаў, перакананняў, ідэй, канцэпцый, звязаных з успрыманнем сваей Радзімы і фарміраваннем адносін да яе. Прадугледжвае развіцце ў асобы пачуцця любові да Радзімы і да самога сябе ў працэсе выхавання і навучання ў адукацыйных установах усіх тыпаў і відаў.

Асэнсоўваючы напісанае вышэй, варта адзначыць, што працэс патрыятычнага выхавання ўключае ў сябе тры асноўных аспекта, паміж якімі існуе непарыўная сувязь і ўзаемаабумоўленасць: кагнітыўны (веды аб гісторыі і традыцыях роднага краю), эмацыянальна-пачуццёвы (патрыятычныя пачуцці, стаўленне да Радзімы) і практычна-дзейсны (дзеянні на карысць Радзімы).

У працэсе выхавання, навучання, зносін з людзьмі, у працэсе разнастайнай дзейнасці асобы, веды могуць мяняцца, удакладняцца, паглыбляцца, адлюстроўвацца ў пачуццях, і як вынік, замацоўвацца ў выглядзе пэўных тэрмінаў. Адзначым, што кагнітыўны аспект выхавання патрыятызму ўяўляе сабой сукупнасць ведаў, тэорый, ідэй, канцэпцый, звязаных з успрыманнем сацыяльнымі суб'ектамі сваёй Радзімы, разуменнем навучэнцамі сутнасці патрыятызму. Ядром кагнітыўнага аспекта з'яўляюцца веды аб родным краі, аб Радзіме, яе гістарычным мінулым і сучасным, веданне роднай мовы і літаратуры, вуснай народнай творчасці, нацыянальнай культуры.

У навучэнцаў даволі важную ролю іграюць нацыянальныя стэрэатыпы, гэта абумоўлена неразвітасцю патрыятычных пачуццяў, абмежаванай інфармацыяй аб гісторыі, культуры, традыцыях роднага краю, што дае падставу ім рабіць прадузятыя вывады аб Радзіме, якія ствараюць яе адмоўны вобраз і не спрыяюць фарміраванню патрыятызму.

Такім чынам, відавочны той факт, што кагнітыўны аспект мяжуе з эмацыянальна-пачуццевым і адгрывае немалаважнае значэнне ў патрыятычным выхаванні, бо без ведання гісторыі і традыцый роднага краю, альбо недахопу ведаў у гэтым напрамку, немагчыма казаць пра эмацыянальна-пачуццёвы аспект выхавання, так як валоданне скажонай інфармацыяй альбо яе адсутнасць не выклікае станоўчых пачуццяў.

Патрыятычныя пачуцці (эмацыянальна-пачуццёвы аспект патрыятычнага выхавання) – гэта эмацыянальна-пачуццёвая сфера патрыятычнай свядомасці, якая ўключае ў сябе пачуцці, эмоцыі, ідэалы, хваляванні, каштоўнасныя арыентацыі, якія адлюстроўваюць стаўленне да Радзімы, навакольнага свету і інш. Эмацыянальна-пачуццёвая сфера фарміруе матывы, інтарэсы, запатрабаванні навучэнцаў, і тым самым мяжуе з дзейсным кампанетам. Калі навучэнец нічога не адчувае на эмацыянальным узроўні, ён

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наўрад ці можа зрабіць нешта карыснае для Айчыны, бо ў яго няма для гэтага ніякіх унутранных памкненняў.

Неабходна адзначыць, што трэцім важным кампанентам патрыятызму з'яўляецца дзейснасць, якая мае яскрава выражаную патрыятычную накіраванасць: краязнаўчая, пошукавая дзейнасць, разнастайная праца, звязаная са стварэннем і работай мемарыяльных, гісторыка-краязнаўчых і іншых музеяў, складанне летапісаў свайго краю, збор і назапашванне лепшых узораў вуснай народнай творчасці, удзел у археалагічных раскопках, заняткі ў ваенна-спартыўных гуртках, шмалікія дабрачынныя акцыі і інш. Як піша С.С. Кацэвіч: «Пад патрыятычнай дзейнасцю мы разумеем любы від дзейнасці асобы ці сацыяльнай групы, які абумоўлены сацыяльна-станоўчымі матывамі і накіраваны на росквіт Бацькаўшчыны, абарону яе інтарэсаў і незалежнасці» [5, с. 13].

Відавочны і той факт, што пачуццё патрыятызму нельга прывіць гвалтоўным характарам. Пра гэта казаў яшчэ Аўрэлій Аўгусцін, адзначаючы, што ніхто нічога не робіць добра, калі гэта супраць яго волі, нават калі чалавек робіць нешта станоўчае.

Такім чынам, можна зрабіць вывад аб тым, што патрыятычнае выхаванне прадстаўляе сабой арганізаваны працэс педагагічнага ўздзеяння на розум, пачуцці і волю асобы, які адпавядае кагнітыўнаму, эмацыянальна-пачуццёваму і дзейснаму аспектам фарміравання патрыятызму навучэнцаў.

---

1. *Буткевич, В.В.* Патриотическое воспитание учащихся : история и современность : пособие для педагогов общеобразовательных учреждений, учреждений внешкольного воспитания и обучения / В.В. Буткевич. – Минск : Нац. ин-т образования, 2010. – 207 с.

2. *Барчук, А.Л.* Сістэма патрыятычнага выхавання старшакласнікаў / А.Л. Барчук. – Мінск : БДПУ, 1998. – 146 с.

3. *Грымаць, А.А.* Нацыянальная самасвядомасць і праблемы сацыялізацыі моладзі / А.А. Грымаць // Нацыянальная самасвядомасць і выхаванне моладзі : зб. навук. прац / Нац. ін-т адукацыі ; навук. рэд. : А.С. Лапцёнак, В.А. Салееў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : НІА, 1996. – 119 с.

4. *Патриотическое* воспитание в учебных заведениях отрасли культуры : сб. ст. / Моск. гос. ун-т культуры и искусств ; науч. ред. : И.Н. Романов, Г.А. Смирнов. – М. : МГУКИ, 2004. – 236 с.

5. *Кацэвіч, С.С.* Патрыятычнае выхаванне школьнікаў / С.С. Кацэвіч. – Брэст : Брэсцкая друкарня, 2005. – 157 с.

6. *Чечет, В.В.* Воспитание патриотических чувств / В.В. Чечет. – Минск : Народная асвета, 1977. – 60 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ